# Первая мировая война: национальные движения и гибель империй

# Першая сусветная война: нацыянальныя рухі і гібель імперый

# World War I: national movements and the fall of empires

*УДК 94(476)+323+327*

## БЕЛОРУССКАЯ НАРОДНАЯ РЕСПУБЛИКА В 1918 г.

***Д. П. БРИГАДИН***[1]**, *П. И. БРИГАДИН***[2]

[1]*Государственный институт управления и социальных технологий БГУ, ул. Обойная, 7, 220004, г. Минск, Беларусь*
[2]*Институт бизнеса БГУ, ул. Московская, 5, 220007, г. Минск, Беларусь*

Рассматриваются условия и факторы, которые способствовали созданию Белорусской Народной Республики в 1918 г. Определены особенности геополитических изменений на белорусских землях в связи с заключением 3 марта 1918 г. Брестского мирного договора. Проанализированы подходы разных политических групп к проблеме самоопределения Беларуси, поиска возможных союзников среди руководства больших стран и правительств соседних государств. Очерчена деятельность БНР, направленная на сохранение территориальной целостности Беларуси, международное признание нового государственного образования, показаны усилия по национально-культурному возрождению страны.

***Ключевые слова:*** самоопределение Беларуси; Белорусская Народная Республика; международное признание; территориальная целостность белорусских земель; национально-культурное возрождение.

**Образец цитирования:**
Брыгадзін ДП, Брыгадзін ПІ. Беларуская Народная Рэспубліка ў 1918 г. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя*. 2018;3:10–16.

**For citation:**
Brigadin DP, Bryhadzin PI. The Belarusian People's Republic in 1918. *Journal of the Belarusian State University. History*. 2018;3:10–16. Belarusian.

**Авторы:**
***Денис Петрович Бригадин*** – кандидат исторических наук; декан факультета повышения квалификации и переподготовки.
***Петр Иванович Бригадин*** – доктор исторических наук, профессор; директор.

**Authors:**
***Denis P. Brigadin***, PhD (history); dean of the faculty of advanced studies and retraining.
*denisbrigadin@gmail.com*
***Petr I. Bryhadzin***, doctor of science (history), full professor; director.
*director@e-edu.by*

# БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ РЭСПУБЛІКА Ў 1918 г.

***Д. П. БРЫГАДЗІН***[1*]***, П. І. БРЫГАДЗІН***[2*]

[1*]*Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, вул. Шпалерная, 7, 220004, г. Мінск, Беларусь*
[2*]*Інстытут бізнесу БДУ, вул. Маскоўская, 5, 220007, г. Мінск, Беларусь*

Разглядаюцца ўмовы і фактары, якія садзейнічалі стварэнню Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1918 г. Вызначаны асаблівасці геапалітычных змен на беларускіх землях у сувязі з заключэннем 3 сакавіка 1918 г. Брэсцкага мірнага дагавора. Прааналізаваны падыходы розных палітычных груп да праблемы самавызначэння Беларусі, пошуку магчымых саюзнікаў сярод кіраўніцтва вялікіх краін і ўрадаў суседніх дзяржаў. Акрэслена дзейнасць БНР, скіраваная на захаванне тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі, міжнароднае прызнанне новага дзяржаўнага ўтварэння, паказаны намаганні па нацыянальна-культурным адраджэнні краіны.

***Ключавыя словы:*** самавызначэнне Беларусі; Беларуская Народная Рэспубліка; міжнароднае прызнанне; тэрытарыяльная цэласнасць беларускіх зямель; нацыянальна-культурнае адраджэнне.

# THE BELARUSIAN PEOPLE'S REPUBLIC IN 1918

***D. P. BRIGADIN***[a]***, P. I. BRYHADZIN***[b]

[a]*State Institute of Management and Social Technologies of the BSU, 7 Špaliernaja Street, Minsk 220004, Belarus*
[b]*School of Business of the BSU, 5 Maskoŭskaja Street, Minsk 220007, Belarus*

*Corresponding author: D. P. Brigadin (denisbrigadin@gmail.com)*

In the article the conditions and factors that contributed to the creation of the Belarusian People's Republic in 1918 are considered. Specifics of geopolitical changes in the Belarusian lands are reflected in connection with the conclusion of the Brest Peace Agreement on 3 March 1918. The author analyzed the approaches of different political groups to the problem of self-determination of Belarus, the search for possible allies among the large states and governments of neighboring countries. The activities of the BPR aimed at preserving the territorial integrity of Belarus, international recognition of the new state formation, attempts of national cultural revival of the country are revealed.

***Key words:*** self-determination of Belarus; Belarusian People's Republic; international recognition; territorial integrity of the Belarusian lands; national cultural revival.

## Уводзіны

На пачатку 1918 г. беларускія землі ў чарговы раз сталі арэнай супрацьстаяння вялікіх краін. Перамовы Савецкай Расіі з Германіяй аб падпісанні мірнага дагавора зайшлі ў тупік. Германская дэлегацыя патрабавала значных тэрытарыяльных уступак. Савецкая дэлегацыя на чале з Л. Троцкім заявіла аб спыненні вайны, дэмабілізацыі арміі і неабходнасці заключэння міру без анексій і кантрыбуцый. У адказ нямецкае камандаванне 16 лютага аб'явіла аб заканчэнні перамір'я з Расійскай Рэспублікай 18 лютага ў 12 гадзін. Германскія войскі перайшлі ў наступленне. Большая частка Беларусі апынулася пад нямецкай акупацыяй. Гэта змяніла палітычную сітуацыю ў Беларусі.

## Асноўная частка

Наступленне германскіх войск прывяло да ліквідацыі савецкай улады на Беларусі. У ноч з 19 на 20 лютага Саўнаркам Заходняй вобласці з'ехаў у Смаленск. З турмы выйшлі дзеячы Цэнтральнай беларускай вайсковай рады. Распараджэннем Выканаўчага камітэта Рады Усебеларускага з'езда К. Езавітаў быў прызначаны камендантам г. Мінска. За яго подпісам 20 лютага з'явіўся загад аб увядзенні ваеннага становішча ў горадзе. Выканаўчы камітэт у ноч на 21 лютага, калі нямецкія войскі ў Мінск яшчэ не ўступілі, абвясціў сябе вышэйшай уладай. У выдадзенай 21 лютага Першай Устаўной грамаце да народаў Беларусі падкрэслівалася, што «беларускі народ павінен здзейсніць свае права на поўнае самавызначэнне, а нацыянальныя меншасці – на нацыянальна-персанальную аўтаномію. Правы нацый павінна знайсці сваё здзяйсненне шляхам склікання на дэмакратычных пачатках Устаноўчага сойма. Выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з'езда, дапоўнены прадстаўнікамі рэвалюцыйнай дэмакратыі нацыянальных меншасцей, абвяшчае сябе часовай уладай на Беларусі»[1] [1, с. 111].

[1]Тут і далей цытаты прыводзяцца ў адпаведнасці з нормамі сучаснай арфаграфіі і пунктуацыі. – *Д. Б., П. Б.*

На наступны дзень, 22 лютага 1918 г., быў надрукаваны спіс членаў урада: І. Варонка (народны сакратар замежных спраў), І. Макрэеў (народны сакратар унутраных спраў), А. Смоліч (народны сакратар адукацыі), Я. Бялевіч (народны сакратар юстыцыі), І. Серада (народны сакратар народнай гаспадаркі), В. Рэдзька (народны сакратар транспарту), Г. Белкінд (народны сакратар фінансаў), П. Бадунова (народны сакратар сацыяльнай абароны), П. Злыбін (народны сакратар вялікарускіх спраў), А. Карач (народны сакратар пошт і тэлеграфа), П. Крачэўскі (народны сакратар кантролю), Т. Грыб (народны сакратар земляробства), К. Езавітаў (народны сакратар ваенных спраў), М. Гутман (без партфеля), Л. Заяц (кіраўнік спраў) [1, с. 41]. Народны сакратарыят Беларусі стварыў беларускую камендатуру, навёў адносны парадак у горадзе. Выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з’езда ўвайшоў у кантакт з гарадскім самакіраваннем, земствам, прадстаўнікамі грамадскіх і палітычных арганізацый.

Нямецкая ваенная ўлада, якая ўсталявалася ў Мінску 22 лютага, аднеслася да дзейнасці Народнага сакратарыята Беларусі стрымана. Але калі ён стаў прэтэндаваць на ўладныя функцыі і выдаў 25 лютага пастанову № 1, паводле якой «казённая маёмасць, установы, капіталы і каштоўнасці, якія ў іх знаходзяцца і складаюць народную ўласнасць, аб’яўляюцца народным здабыткам і пераходзяць у ведамства і распараджэнне Народнага сакратарыята Беларусі»[2], акупацыйныя ўлады прымянілі сілу. Дэлегацыя Народнага сакратарыята Беларусі на чале з І. Варонкам 28 лютага 1918 г. наведала рэзідэнцыю германскай адміністрацыі ў Мінску і выказала лаяльнасць у дачыненні да нямецкай акупацыйнай улады.

Пасля акупацыі большай часткі Беларусі войскамі кайзераўскай Германіі лідары беларускага нацыянальнага руху дзейнічалі ў надзвычай складаных палітычных умовах. Германскія акупацыйныя ўлады насцярожана адносіліся да Народнага сакратарыята Беларусі па прычыне яго «сацыялістычнага» складу. Ім больш імпаніравала палітычная пазіцыя віленскай групы беларускага нацыянальнага руху на чале з братамі Антонам і Іванам Луцкевічамі, Вацлавам Ластоўскім, Янам Станкевічам і іншымі дзеячамі, якія 25 студзеня 1918 г. на канферэнцыі беларускіх арганізацый Віленшчыны ўтварылі Віленскую беларускую раду. Апошняя заняла адкрытую прагерманскую пазіцыю. Віленская беларуская рада 19 лютага прыняла пастанову, згодна з якой сувязь паміж Беларуссю і Расіяй абвяшчалася парванай [2, с. 281].

Віленскія дзеячы выступілі з ідэяй беларускай дзяржаўнасці ў этнічных межах рассялення беларусаў. Пазней рэйхсканцлер Германіі адкрыта даў ведаць Народнаму сакратарыяту Беларусі, што Берлін разглядае Беларусь як «частку Савецкай Расіі і па Берасцейскім угаворы без урада Леніна гэта пытанне сам вырашыць не можа» [3, с. 12].

Ідэя незалежнасці ў беларускім грамадстве ўзмацнілася ў перыяд падрыхтоўкі Брэсцкага мірнага дагавора пасля яго падпісання 3 сакавіка 1918 г. Прадстаўнікоў Выканаўчага камітэта Рады Усебеларускага з’езда (А. Цвікевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, І. Серада), якія былі накіраваны ў Брэст, не прызналі паўнамоцнымі прадстаўнікамі беларускага народа. Яны атрымалі статус дарадцаў дэлегацыі Украінскай Народнай Рэспублікі. Беларуская дэлегацыя ўручыла сваю дэкларацыю аб непадзельнасці беларускіх зямель і іх аўтаноміі ў складзе Расійскай федэрацыі, правах нацыянальных меншасцей, стварэнні міжнароднага фонда для фінансавання парушанай вайной эканомікі і інш. «Мы сваім прыездам, – пісалі С. Рак-Міхайлоўскі і А. Цвікевіч, – ужо трохі перамітусілі карты, і толькі шкада, што трохі спазніліся, але наша мэта – незалежнасць Беларусі ў этнаграфічных яе граніцах – ужо зрабіла ўражанне на немцаў і ўчора вечарам Карахан па тэлефоне адмовіўся з намі гаварыць доўга, кажучы што “мне вядомы тыя мэты, з якімі Вы прыехалі”» [4, с. 35].

Сітуацыя ўскладнялася тым, што яшчэ 9 лютага 1918 г. германскі блок падпісаў дамову з Украінскай Народнай Рэспублікай, у якой гаварылася не толькі аб межах Украіны з Аўстра-Венгрыяй, але і аб перадачы Украіне часткі зямель Брэстчыны на ўсход ад Буга.

У гэтых умовах Выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з’езда 9 сакавіка 1918 г. аб’явіў Другую Устаўную грамату да народаў Беларусі. Беларусь абвяшчалася Народнай Рэспублікай у межах этнічнага рассялення і колькаснай перавагі беларусаў. У Другой Устаўной грамаце замацоўваліся сацыяльныя здабыткі (васьмігадзінны рабочы дзень), абвяшчалася свабода слова, друку, сходаў, забастовак, веравызнання, роўны статус усіх моў народаў Беларусі. Калі раней вырашэнне пытання аб зямлі адкладвалася да Усебеларускага ўстаноўчага сходу, то ў адпаведнасці з сёмым пунктам Другой Устаўной граматы скасоўвалася прыватная ўласнасць на зямлю і яна перадавалася тым, хто на ёй працуе[3]. З гэтымі прынцыпамі пагадзіліся розныя плыні грамадска-палітычнага руху Беларусі: меншавікі, эсэры, бундаўцы, паалейцыяністы.

У сувязі з абвяшчэннем Беларускай Народнай Рэспублікі Выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з’езда стаў называцца Радай І Усебеларускага з’езда, а 18 сакавіка быў пераўтвораны ў Раду Беларускай Народнай Рэспублікі. У яе склад увялі

[2]Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 325. Воп. 1. Спр. 21. Арк. 99.
[3]Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 325. Воп. 1. Спр. 46. Арк. 121.

членаў Віленскай беларускай рады А. Луцкевіча, І. Луцкевіча, Д. Сямашку, Я. Станкевіча і Я. Туркевіча, якія прыехалі ў Мінск. Гэта значна ўмацавала незалежніцкую плынь у Радзе БНР.

На першым пасяджэнні Рады БНР 19 сакавіка былі зацверджаны Першая і Другая Устаўныя граматы, а таксама вызначаны склад Рады БНР. Колькасна ён павялічваўся з 27 да 71 чалавека. Акрамя былых членаў Выканкама Савета Усебеларускага з'езда, якія лічыліся пераемнікамі ўлады, атрыманай ад І Усебеларускага з'езда, у склад Рады БНР увайшлі 9 членаў ад правінцыяльных беларускіх рад, 10 – ад Мінскага земства, 10 – ад гарадскога самакіравання, 15 – ад нацыянальных меншасцей (7 яўрэяў, 4 палякі, 2 рускія, 1 літовец і 1 украінец). Быў абраны Прэзідыум Рады БНР на чале з І. Серадой. Галоўнае, на што, па прызнанні І. Воронкі, накіроўваліся «нечалавечыя намаганні беларускіх дзеячаў, пачынаючы з моманту разгону І Усебеларускага з'езда», было «паставіць Беларусь хаця б у асяродак малых дзяржаў і дабіцца прызнання самастойнасці Беларускай Народнай Рэспублікі» [5, с. 7]. Але яшчэ 10 сакавіка ўрад Германіі адхіліў пасланую яму ноту аб прызнанні Беларускай Народнай Рэспублікі.

Праблема дзяржаўнага самавызначэння заставалася. Арыентацыя на Расію пасля разгону бальшавіцкімі ўладамі Усебеларускага з'езда, Устаноўчага сходу (6 студзеня 1918 г.), заключэння Брэсцкага міру (3 сакавіка 1918 г.) губляла сваіх прыхільнікаў. Кіраўніцтва Рады БНР, як пазней канстатаваў А. Луцкевіч, усе свае далейшыя надзеі ўсклала на кайзераўскую Германію, імкнучыся ўмацаваць саюз з ёй у той ці іншай форме [6, с. 141].

На пасяджэнні Рады БНР 24 сакавіка абмяркоўваліся праблемы абвяшчэння незалежнасці рэспублікі. Дыскусія доўжылася 10 гадзін, выступілі 26 чалавек. «Атмасфера наэлектрызавалася», – сведчыць пратакол пасяджэння[4]. Толькі ў 6 гадзін раніцы 25 сакавіка была прынята рэзалюцыя аб абвяшчэнні незалежнай рэспублікі. Гарадская група Рады БНР і прадстаўнікі Бунда галасавалі супраць, земская група (9 чалавек) у знак пратэсту пакінула залу. Ад галасавання ўстрымаліся прадстаўнікі Аб'яднанай яўрэйскай сацыялістычнай партыі, Паалей Цыёна і сацыялістаў-рэвалюцыянераў.

Пасля аднаўлення ў 12 гадзін дня пасяджэння была прынята Трэцяя Устаўная грамата Рады БНР, якая аб'яўляла аб стварэнні беларускай дзяржаўнасці: «Ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца незалежнай і вольнай дзяржавай» [7, с. 261–262].

За аддзяленне Беларусі ад Расіі галасавалі 40 членаў Рады БНР, супраць – 22, устрымаліся 9 удзельнікаў галасавання. Згодна з трэцяй Устаўной граматай Беларуская Народная Рэспубліка аб'яўлялася ў складзе ўсіх беларускіх зямель. Грамата пацвярджала правы і свабоды грамадзян і народаў Беларусі, якія абвяшчаліся ў Другой Устаўной грамаце [7, с. 261].

На паскарэнне прыняцця Трэцяй Устаўной граматы паўплывалі дзяржаваўтваральныя працэсы, што мелі месца ў суседніх краінах. Нямецкія ўлады прызналі незалежнасць Украіны. Пасля прыняцця Літоўскай Тарыбай акта аб незалежнасці Літвы германскі ўрад 23 сакавіка 1918 г. прызнаў незалежнасць Літвы (дэкларацыя Літоўскай Тарыбы аб супрацоўніцтве і саюзе з Германіяй была прынята яшчэ 11 снежня 1917 г.).

На чарговым пасяджэнні Рады БНР 29 сакавіка была ўнесена прапанова сямі яе членаў аб уключэнні ў парадак дня пытання «разгляду пажадання федэрыравання з Вялікарасіяй, Украінай і Літвой». Аднак большасцю галасоў прапанова не была прынята для абмеркавання. У гэтых умовах Народны сакратарыят Беларусі пакінулі народныя сакратары фінансаў, унутраных спраў, транспарту, пошт і тэлеграфа [8, с. 58].

Устаўныя граматы вызначылі найважнейшыя палажэнні аб грамадскім і дзяржаўным ладзе Беларусі. БНР была абвешчана на тэрыторыі, дзе ўлада належала нямецкай акупацыйнай адміністрацыі. Рэалізацыя ідэй аб дзяржаўнай самастойнасці абмяжоўвалася палітыкай кайзераўскай Германіі ў беларускім пытанні.

На пятым пасяджэнні Рады БНР 12 красавіка пад старшынствам І. Серады ў склад Рады былі прыняты 10 членаў Мінскага беларускага прадстаўніцтва (Р. Скірмунт, А. Уласаў, протаіерэй Кульчыцкі, ксёндз В. Гадлеўскі, адвакат П. Аляксюк і інш.).

Правае крыло Рады БНР 25 красавіка 1918 г. выступіла з ініцыятывай прыняць тэкст тэлеграмы германскаму кайзеру Вільгельму ІІ, у якой І. Серада, І. Воронка, Р. Скірмунт, Я. Лёсік, А. Аўсянік, П. Аляксюк, П. Крачэўскі звярталіся са словамі падзякі «за вызваленне Беларусі» і прасілі абароны ў справе «ўмацавання дзяржаўнай незалежнасці і недзялімасці края ў саюзе з Германскай імперыяй» [7, с. 263]. Тэкст тэлеграмы быў прыняты пад грыфам «сакрэтна». За адпраўку тэлеграмы галасавалі 35 членаў Рады БНР, супраць – 4, устрымаліся 7 асоб.

Дэлегаты БНР (А. Цвікевіч, М. Доўнар-Запольскі, П. Трэмповіч) 25 красавіка звярнуліся да германскага пасла пры ўрадзе Украінскай Рады з просьбай аб «прызнанні самастойнасці Беларусі і ўлады ў ёй у асобе Рады і яе кааліцыйнага міністэрства, захаванні Беларусі ў яе натуральных гістарычных, этнаграфічных і эканамічных межах» [4, с. 46]. У звароце адзначалася, што для Германіі ёсць рэальная выгада пайсці насустрач стварэнню дзяржаўнасці ў Беларусі.

[4]Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 325. Воп. 1. Спр. 8. Арк. 5.

Такая палітыка выклікала ўнутрыпалітычны крызіс урада і Рады БНР. Са складу Рады БНР выйшлі гарадская група, прадстаўнікі Бунда, Аб'яднанай яўрэйскай сацыялістычнай партыі. У знак пратэсту супраць адпраўкі тэлеграмы Т. Грыб, П. Бадунова 1 мая выйшлі са складу Народнага сакратарыята БНР. Разам з членамі Рады БНР М. Пашкевічам, Н. Нямкевічам, М. Шылам і іншымі дзеячамі яны засталіся ў Радзе БНР як апазіцыя. Месцы гарадской групы ў Радзе БНР занялі прадстаўнікі культурных, навуковых і прафесійных арганізацый, Мінскай яўрэйскай абшчыны.

На X пасяджэнні Рады БНР 14 мая члены Народнага сакратарыята Беларусі І. Воронка, А. Смоліч, П. Крачэўскі, Л. Заяц, І. Серада і К. Езавітаў заявілі пра сваю адстаўку[5]. Фарміраванне новага складу Народнага сакратарыята Беларусі было даручана Р. Скірмунту. У склад Прэзідыума Рады БНР тайным галасаваннем выбралі Я. Лёсіка (старшыня), А. Смоліча і А. Уласава (таварышы старшыні), П. Крачэўскага і Лянкоўскага (сакратары). Аднак ужо 23 мая Р. Скірмунт вымушаны быў афіцыйна заявіць аб немагчымасці сфарміраваць новы склад сакратарыята. Прадстаўнікі фракцыі злучаных сацыялістаў змянілі першапачатковую пазіцыю супрацоўніцтва. Урадавыя функцыі працягваў выконваць ранейшы склад Народнага сакратарыята Беларусі.

26 мая Р. Скірмунт быў накіраваны ў Кіеў на перагаворы з гетманам Скарападскім, які прыйшоў да ўлады ва Украіне. Урад Скарападскага стаў актыўна праводзіць палітыку захопу паўднёвых зямель Беларусі. Беларуская дэлегацыя перадала ўкраінскім уладам прапановы аб дзяржаўнай мяжы, але падпісанне дагавора з БНР адкладвалася. Між тым у Кіеве былі адкрыты Генеральнае консульства БНР і Беларуская гандлёвая палата.

Кіраўнікі БНР прыкладалі намаганні, каб знайсці падтрымку ў германскіх акупацыйных улад. Камандуючы 10-й арміі генерал Э. фон Фалькенгайн 27 мая заявіў беларускай дэлегацыі ў складзе І. Варонкі, П. Аляксюка, І. Серады, А. Аўсяніка, што «германскае кіраўніцтва прымае ва ўвагу імкненне Народнага сакратарыята і Рады жыць у згодзе і дружбе з Германскай дзяржавай, а гэта ў недалёкім будучым дасць Беларусі дадатныя вынікі»[6].

Была дасягнута дамоўленасць аб стварэнні інстытута дарадчыкаў пры павятовых камендантах з мэтай урэгулявання ўзаемаадносін насельніцтва і германскіх войск. Асаблівая ўвага звярталася на культурна-асветніцкую працу. Як адзначаў І. Варонка, «беларуская справа стала заваёўваць усё болей і болей правоў» [3, с. 12]. Але практычная дзейнасць створаных на тэрыторыі Беларусі гарадскіх дум, управ, земстваў жорстка кантралявалася нямецкімі ўладамі. Ухіленне ад выканання іх распараджэнняў вяло да роспуску мясцовых органаў самакіравання.

Афіцыйнае непрызнанне БНР Германіяй і адначасовае спрыянне дзейнасці ўрадавых структур рэспублікі пад аховай 10-й арміі адлюстроўвала своеасаблівую тактыку паводзін акупацыйных улад, абумоўленую эвалюцыяй іх поглядаў на беларускае пытанне. У 1915–1916 гг. яны былі пераканаы ў нявздольнасці беларусаў на нацыянальнае самавызначэнне. Аднак у пачатку 1918 г. Германія пераканалася ў рэальнасці беларускага нацыянальна-палітычнага руху, дзякуючы якому ўзніклі ўладныя структуры, праводзілася актыўная дзейнасць па стварэнні беларускай дзяржаўнасці.

Пасля вяртання Р. Скірмунта з Кіева, а ён там знаходзіўся каля месяца, міжфракцыйная палітычная барацьба за ўладу абвастрылася. На пасяджэнні сесіі Рады БНР 9–11 ліпеня была прынята прапанова Мінскага прадстаўніцтва (22 галасы – за, 18 – супраць) аб стварэнні новага складу Народнага сакратарыята Беларусі, які, згодна з рашэннем Рады БНР ад 9 ліпеня, узначаліў Р. Скірмунт. У знак пратэсту прадстаўнікі фракцый блока І. Варонкі і сацыялістаў-рэвалюцыянераў пакінулі залу пасяджэнняў.

Крызіс у дзейнасці Народнага сакратарыята Беларусі і Рады БНР прывёў да адстаўкі кабінета Р. Скірмунта 20 ліпеня. Надзеі на кайзераўскую Германію не спраўдзіліся: 27 жніўня 1918 г. Германія і Савецкая Расія падпісалі дадатковы дагавор. У ім адзначалася, што «Германія ніякім чынам не будзе ўмешвацца ў адносіны паміж Рускай дзяржавай і яе асобнымі абласцямі і, значыць, яна ў асаблівасці не будзе ні выклікаць, ні падтрымліваць утварэнне самастойных дзяржаўных арганізмаў у гэтых абласцях» [4, с. 58]. Беларусь была падзелена на пяць рэгіёнаў. Частка Гродзеншчыны і Віленшчыны ўключалася ў склад Усходняй Прусіі (Германія). Тэрыторыя на захад ад лініі Рыга – Дзвінск – Ліда – Пружаны адыходзіла ў склад Літвы. Цэнтральныя землі Беларусі аб'ўляліся часовай акупацыйнай зонай. Усходнія раёны Беларусі знаходзіліся ў складзе Расіі, а паўднёвыя землі перадаваліся Украіне. «Надзвычайная дэлегацыя БНР» (А. Луцкевіч, І. Варонка, А. Аўсянік, Г. Базарэвіч) 23 верасня ўручыла прадстаўніку СНК Савецкай Расіі ў Кіеве Х. Ракоўскаму ноту пратэсту ў сувязі з падпісаннем Расіяй дадатковага пратакола да Брэсцкага дагавора.

У гэтых абставінах блок сацыялістаў у Радзе БНР пашырыў свой уплыў. У канцы верасня ў Раду БНР увайшлі прадстаўнікі нацыянальных меншасцей і духавенства. У пачатку кастрычніка Рада БНР

[5]Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 325. Воп. 1. Спр. 10. Арк. 119.
[6]Там жа. Спр. 21. Арк. 196.

зацвердзіла Статут Беларускае Народнае Рэспублікі. У ім падкрэслівалася, што да выбару Сойма БНР заканадаўчая ўлада належыць Радзе БНР, а вышэйшая выканаўчая ўлада – Народнаму сакратарыяту Беларусі. Пазней, 11 кастрычніка, Народны сакратарыят Беларусі быў перайменаваны ў Раду Народных Міністраў.

Кіраўніцтва БНР шукала саюзнікаў у справе дзяржаўнага самавызначэння сярод розных палітычных сіл. Так, 10 кастрычніка надзвычайная дэлегацыя Рады БНР на чале з А. Луцкевічам у чарговы раз звярнулася да міністра замежных спраў Украіны з прапановай аб афіцыйным прызнанні дзяржаўнай незалежнасці Беларусі.

Таксама беларуская дэлегацыя накіравала старшыні рэйхстага і рэйхсканцлеру 18 кастрычніка Германіі ноту аб прызнанні дзяржаўнай незалежнасці Беларусі, каб «даць магчымасць беларускаму ўраду здзейсніць прыналежныя яму функцыі дзяржаўнага будаўніцтва і ўпраўлення, а разам з гэтым арганізаваць аружную сілу дзеля самаабароны» [4, с. 66].

Да прэзідэнта Паўночна-Амерыканскіх Злучаных Штатаў, да нейтральных і ваюючых дзяржаў Рада БНР звярнулася 20 кастрычніка з просьбай аб падтрымцы «безабароннай Беларусі ад разгрому... забяспечыць ёй знешнюю недатыкальнасць прызнаннем яе самастойнасці і незалежнасці…» [4, с. 67].

У гэты ж дзень у Берлін была накіравана дэлегацыя БНР (Р. Скірмунт, Я. Лёсік, К. Савіч, І. Луцкевіч, Ш. Разенбаўм) з прапановай прызнаць незалежнасць Беларусі, што «надзвычайна своечасова і неабходна як у інтарэсах Беларусі, так і ў інтарэсах самой Германіі» [4, с. 68]. Канцлер Германіі 20 кастычніка 1918 г. прыняў дэлегацыю Літоўскай Тарыбы і пацвердзіў прызнанне незалежнасці літоўскай дзяржавы. У той жа час дэлегацыя Рады БНР не была прынята канцлерам [9, с. 293]. Такім чынам, Рада БНР не знайшла падтрымкі сярод кіраўніцтва вялікіх краін свету.

Крах надзей кіраўнікоў БНР на прызнанне і падтрымку заходнімі краінамі вымусіў іх шукаць кантакты з урадам РСФСР. Яшчэ ў верасні 1918 г. дэлегацыя БНР на чале з А. Луцкевічам правяла перамовы ў Кіеве з Х. Ракоўскім. У лістападзе на перагаворы ў Маскву выязджалі А. Луцкевіч, Т. Грыб.

У лістападзе змянілася палітычная сітуацыя ў Еўропе. У Любліне 7 лістапада быў створаны Часовы народны ўрад Польскай Рэспублікі. Паражэнне германа-аўстрыйскага блока, рэвалюцыя ў Германіі стварылі ўмовы для анулявання Брэсцкага мірнага дагавора (13 лістапада). Чырвоная армія пачала рух на захад. У гэтых абставінах большасць членаў Рады БНР з’ехала ў Вільню, дзе вяліся актыўныя перагаворы Віленскай беларускай рады з прадстаўнікамі літоўскага ўрада. У канцы лістапада 1918 г. у склад Дзяржаўнага Савета Літвы ўвайшлі 6 членаў Віленскай беларускай рады (В. Ластоўскі, І. Луцкевіч, Я. Станкевіч, К. Фалькевіч, Д. Сямашка, ксёндз В. Талочка).

Пры літоўскім урадзе было створана Міністэрства беларускіх спраў, якое ўзначаліў І. Варонка. Міністэрства прадстаўляла кандыдатаў-беларусаў на пасады кіраўнікоў гарадскіх і павятовых органаў самакіравання, школьных інспектараў, суддзяў, следчых, ляснічых. Такія прадстаўнікі з ліку беларусаў былі прызначаны ў Гродна, Беласток, Ліду, Бельск, Белавежу, Дзятлава, Крынкі і Саколку. Тэрыторыя, на якую распаўсюджвалася юрысдыкцыя Міністэрства беларускіх спраў, павінна была мець статус аўтаномнай адзінкі з урадавай беларускай мовай.

Міністэрства беларускіх спраў займалася і вайсковай справай. Генералам К. Кандратовічам, які некаторы час з’яўляўся віцэ-міністрам краёвай абароны ў складзе літоўскага ўрада, вялася праца па арганізацыі беларускага войска. Быў сфарміраваны першы беларускі полк пад камандаваннем М. Лаўрэнцьева, якога затым змяніў К. Езавітаў. Вайсковае фарміраванне дыслацыравалася ў Гродне.

Намаганнямі міністэрства і беларускіх дзеячаў былі сфарміраваны Гродзенская губернская беларуская ўправа, беларуская камендатура горада і Гродзенская ваенная акруга, адкрыты прафесійныя саюзы настаўнікаў, чыгуначнікаў, беларускія клубы, бібліятэкі. Дзейнічаў беларускі нацыянальны тэатр і хор. Выдаваліся газеты «Бацькаўшчына», «Беларускі народ», часопіс беларускага культурна-асветніцкага таварыства «Бацькаўшчына».

## Заключэнне

Такім чынам, на працягу 1918 г. кіраўнікі БНР, супрацоўнікі розных устаноў рэспублікі вялі актыўную палітыку, скіраваную на прызнанне незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі. Беларускія дыпламатычныя місіі, консульствы, прадстаўніцтвы былі адкрыты ва Украіне, Расіі, Літве, Германіі, Польшчы, Балгарыі, Фінляндыі, Чэхаславакіі, Латвіі, Эстоніі, Турцыі. Але дабіцца прызнання незалежнасці краіны яны не змаглі.

Былі зроблены крокі на шляху нацыянальна-культурнага адраджэння: адкрываліся беларускія школы, гімназіі, установы культуры, пад кантролем БНР выходзіла мноства беларускіх газет. Аднак значныя геапалітычныя змены ў Еўропе ў канцы 1918 г. абумовілі новы расклад палітычных сіл на беларускіх землях. У 1919 г. праблемы дзяржаўнага будаўніцтва вырашаліся ўжо іншымі палітыкамі і на іншай – савецкай – аснове.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Турук Ф. *Белорусское движение. Очерк истории национального и революционного движения белорусов.* Минск: [б. и.]; 1994.

2. Сідарэвіч А. Віленская беларуская рада. У: Пашкоў ГП, рэдактар. *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 2. Беліцк – Гімн.* Мінск: БелЭн; 1994. С. 281.

3. Варонка Я. *Беларускі рух ад 1917 да 1920: кароткі агляд.* Коўна: Таварыства імя Ф. Скарыны; 1920.

4. *Знешняя палітыка Беларусі. Т. 1. 1917–1922* [зборнік дакументаў і матэрыялаў]. Мінск: БелНДІДАС; 1997.

5. Воронко ИЯ. *Белорусский вопрос к моменту Версальской мирной конференции. Историко-политический очерк.* Ковно: Госбиблиотека БССР; 1919.

6. Михнюк ВН, Климович НМ, Гесь АИ. Апостол национального возрождения. *Неман.* 1995;1:127–166.

7. Ладысеў УФ, Брыгадзін ПІ. *Паміж Усходам і Захадам: станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.).* Мінск: БДУ; 2003.

8. Чернякевич А. *БНР. Триумф побежденных.* Минск: А. Н. Янушкевіч; 2018.

9. Міхалюк Д. *Беларуская Народная Рэспубліка. 1918–1920 гг.: ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці.* Смаленск: Інбелкульт; 2015.

## References

1. Turuk F. *Belorusskoe dvizhenie. Ocherk istorii natsional'nogo i revolyutsionnogo dvizheniya belorusov* [The Belarusian movement. Essay on the history of the national and revolutionary movement of Belarusians]. Minsk: [publisher unknown]; 1994. Russian.

2. Sidarevich A. Vilenskaja belaruskaja rada [Vilna Belarusian Council]. In: Pashkou GP, editor. *Jencyklapedyja gistoryi Belarusi. Tom 2. Belick – Gimn* [Encyclopedia of the history of Belarus. Volume 2. Belick – Himn]. Minsk: BelJen; 1994. Belarusian.

3. Varonka J. *Belaruski ruh ad 1917 da 1920: karotki agljad* [Belarusian movement from 1917 to 1920: an overview]. Koŭna: Tavarystva imja F. Skaryny; 1920. Belarusian.

4. *Zneshnjaja palityka Belarusi. T. 1: 1917–1922* [Foreign policy of Belarus. Volume 1: 1917–1922] [a collection of documents and materials]. Minsk: BelNDIDAS; 1997. Belarusian.

5. Voronko IJ. *Belorusskii vopros k momentu Versal'skoi mirnoi konferentsii. Istoriko-politicheskii ocherk* [Belarusian issue at the time of the Versailles Peace Conference. Historical and political essay]. Kovno: Gosbiblioteka BSSR; 1919. Russian.

6. Mikhnyuk VN, Klimovich NM, Ges' AI. Apostol natsional'nogo vozrozhdeniya [An Apostle of the National Renaissance]. *Neman.* 1995;1:127–166. Russian.

7. Ladysev UF, Bryhadzin PI. *Pamizh Ushodam i Zahadam: stanawlenne dzjarzhawnasci i tjerytaryjal'naj cjelasnasci Belarusi (1917–1939 gg.)* [Between East and West: the establishment of statehood and territorial integrity of Belarus (1917–1939)]. Minsk: BSU; 2003. Belarusian.

8. Chernyakevich A. *BNR. Triumf pobezhdennykh* [BNR. Triumph of the defeated]. Minsk: A. N. Yanushkevich; 2018. Russian.

9. Mikhalyuk D. *Belaruskaja Narodnaja Rjespublika. 1918–1920 gg.: lja vytokaw belaruskaj dzjarzhawnasci* [Belarusian People's Republic. 1918–1920: at the origins of the Belarusian statehood]. Smolensk: Inbelkul't; 2015. Belarusian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 05.04.2018.*
*Received by editorial board 05.04.2018.*